Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. ПЯТНІЦА № 199 (28309)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Мацярынства ўвасабляе лепшыя чалавечыя якасці

***Дарагія суайчынніцы!***

Ад усяго сэрца віншую вас з Днём маці.

Гэта свята падкрэслівае вялікую ролю жанчыны, якая дорыць жыццё, аберагае і выхоўвае дзяцей, з'яўляецца захавальніцай сямейных традыцый.

Для кожнага чалавека з вобразам маці звязаны самыя цёплыя пачуцці, светлыя, шчаслівыя ўспаміны.

Мацярынства ўвасабляе лепшыя чалавечыя якасці — самаадданасць і высакароднасць, клопат аб блізкіх і кіраванне высокім маральным абавязкам, духоўнасць і маральнасць, якія сёння асабліва патрэбныя нашаму грамадству.

Шчыра жадаю ўсім маці моцнага здароўя, дабра і сямейнага дабрабыту.

Няхай у вашых дамах заўсёды пануюць згода, любоў і мір.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# Трымай мяне, мама!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар ЛІСКОВІЧ, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:**

*«Толькі з пачатку 2015 года ў рэгіёне нарадзілася 13,7 тысячы дзяцей, на свет з'явіліся больш за 150 двайнят, дзве тройні. Тэндэнцыя па павелічэнні нараджальнасці назіраецца на працягу некалькіх гадоў. Гэта яшчэ раз падкрэслівае ўпэўненасць у будучыні. У вобласці сёння ў больш чым 11 тысячах шматдзетных сем'яў выхоўваецца больш за 36 тысяч дзяцей. Гэта цэлая армія дружных сем'яў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9305 | ▲ |
| Еўра | 2,1255 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0304 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0748 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

16199

■ Жыллёвая спрэчка

## «Я НЕ ПРАШУ ШЫКОЎНАСЦІ, ЗГОДНА НА КАЛЯСАЧНУЮ»

Прадпрыемства выдзеліла жанчыне кватэру, а цяпер сцвярджае, што яна сама туды засялілася

**«Я 12 гадоў адпрацавала ў ЖЭСе. А цяпер аказалася непатрэбнай, і мяне з сям'ёй выганяюць на вуліцу». У сціпла абстаўленай сталічнай двушцы па вуліцы Прушынскіх, 42 Любоў МАРФЕЛЬ жыве з дзвюма дочкамі і маці-інвалідам. Калі тры гады таму ЖЭС выдзеліў ёй гэту кватэру, жанчына не паверыла свайму шчасцю. Таму факту, што памяшканне не было афіцыйна аформлена, нават не надала ўвагі: маўляў, многія работнікаў так засялялі — і нічога. А цяпер не можа дараваць сабе ўласнай наіўнасці. Суд патрабуе пакінуць кватэру і адмаўляе ў адтэрміноўцы, хоць сям'і няма куды з'язджаць.**

### У ЖЭС — ДЗЕЛЯ ЖЫЛЛЯ

Калі на пачатку 2000-х Любоў Станіславаўна разам з мужам пераехалі ў сталіцу, абодва ўладкаваліся на работу ў ЖЭС.

— Усе туды ішлі працаваць дзеля кватэры, — не хавае жанчына. Сустракаемся з ёй у той самай двушцы: недарагая мэбля, частка якой засталася ад папярэдняга жыльца-электрыка і грошы за якую Любоў Станіславаўна вяртала паўгода, фатаграфіі дачок на сцяне, іконы над пісьмовым сталом. — Раней жыллё давалі толькі дворнікам і майстрам. Ні бухгалтарам, ні эканамістам не давалі. Таму муж пайшоў майстрам, я — прыбіральшчыцай... Ведаеце, адзнакі ў школе былі нядрэнныя, і я думала: дзякуй богу, што ніхто мяне не бачыць тут з аднакласнікаў. Мне было сорамна, што я мыю пад'езды.

Спачатку сям'і выдзелілі калясачную. Пакой невялікі — 2,5 на 5 метраў, але, кажа Любоў Станіславаўна, ім з адным дзіцем месца хапала. Калі ў доме пачынаўся капітальны рамонт, жанчына папрасіла аформіць гэта памяшканне як жылое, каб потым падаць на прыватызацыю.

— Хоць якая халупа, але свая была б, — разважае яна. — Мне адмовілі. А я па характары мяккацелая, не заўсёды дабіваюся чаго хачу.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## Сонечна і холадна

**Сіноптыкі абяцаюць, што на выхадныя надвор'ем у нас будуць кіраваць скандынаўскі антыцыклон і халодныя паветраныя масы**



**Сапраўды халоднае надвор'е без ападкаў, калі тэмпературны фон будзе на 2—4 градусы ніжэй за кліматычную норму, чакаецца ў Беларусі ў выхадныя, паведамляе галоўны сіноптык службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Адначасова з антыцыклонам з паўночнымі і паўночна-ўсходнімі вятрамі да нас працягнуць паступаць халаднаватыя паветраныя масы. Атмасферны ціск застанецца высокім. У пятніцу будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе ад 3 да 9 цяпла. Галоўны сіноптык упэўнена, што антыцыклон з паніжаным тэмпературным рэжымам застанецца ў нас на даволі працяглы перыяд. У суботу і нядзелю ападкаў па Беларусі не чакаецца. Амаль паўсюдна ўначы тэмпература паветра панізіцца да нуля — мінус 4 градусаў, у некаторых раёнах чакаецца нават да мінус 6 градусаў, і толькі месцамі будзе плюс 1-2. Удзень тэмпература паветра складзе ад плюс 2 да плюс 4 градусаў на паўночным усходзе, да 7—9 цяпла на паўднёвым захадзе.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня надвор'е будзе па-ранейшаму вызначаць скандынаўскі антыцыклон і халодныя паветраныя масы, якія паступаюць з поўначы Еўропы. У панядзелак і аўторак будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, у некаторых раёнах замаразкі будуць дасягаць мінус 6 градусаў. Удзень чакаецца ад 2 да 9 цяпла. Вось і ўсё, другая хваля бабінага лета да нас так і не завітала.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ПЕНСІІ ПАДРАСТУЦЬ

Працоўныя пенсіі з 1 снежня 2016 года павышаюцца ў сярэднім на 5%. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 13 кастрычніка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Фінансаванне расходаў па рэалізацыі дакумента ажыццяўляецца за кошт сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

# КАДРАВЫЯ РАШЭННІ ПРЭЗІДЭНТА

**Марыяна Шчоткіна вызвалена ад пасады міністра працы і сацыяльнай абароны ў сувязі з пераходам на выбарную пасаду. Адпаведны ўказ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 13 кастрычніка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Па той жа прычыне кіраўнік дзяржавы вызваліў ад пасад памочніка Прэзідэнта Беларусі — галоўнага інспектара па Брэсцкай вобласці Дзмітрыя Гобарава, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Японіі Сяргея Рахманава, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Аўстрыі, пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры міжнародных арганізацыях у Вене і Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Беларусі ў Харватыі па сумяшчальніцтве Валерыя Варанецкага, начальніка дэпартамента па матэрыяльных рэзервах МНС Васіля Чэкана.

# АКТЫЎНА СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ ПА ЎСІХ ПЫТАННЯХ

## гатова Беларусь з Курганскай вобласцю

**Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на сустрэчы з губернатарам Курганскай вобласці Аляксеем Какорыным, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Аналізуючы тавараабарот з Курганскай вобласцю, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на фоне паказчыкаў узаемнага гандлю з іншымі расійскімі рэгіёнамі ён пакуль невялікі: па выніках 2015 года яго аб'ём ледзь перавысіў $20 млн. «Нам трэба нямала папрацаваць, каб ён выглядаў дастойна. Мы для гэтага маем усе падставы, і ў нас ёсць такія магчымасці, — сказаў Прэзідэнт. — Таму мы разлічваем, што ваш візіт надасць добры дадатковы імпульс развіццю двухбаковага супрацоўніцтва. Нам трэба выкарыстоўваць існуючы эканамічны патэнцыял для таго, каб тавараабарот быў істотным. Беларусь гатова супрацоўнічаць з вашай вобласцю па ўсіх пытаннях».

«Ведаю аб важкай дзяржаўнай падтрымцы вашага аграпрамысловага комплексу, маштабных планах па яго мадэрнізацыі. Курганская вобласць — гэта, можна сказаць, жытніца, адна з асноў сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі. Таму мы гатовы да супрацоўніцтва, каб дапамагчы ў вырашэнні тых пытанняў, якія вы намецілі ў агракомплексе», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Беларусь дасягнула высокіх вынікаў у сельскай гаспадарцы. «З вялікім задавальненнем нядаўна пачуў з вуснаў майго калегі і сябра, Прэзідэнта Расіі, што ў Расіі трэба пераходзіць да стварэння нармальных умоў для вяскоўцаў. Гэта абсалютна правільна, таму што, не стварыўшы ўмоў, ніякую праблему не вырашыш. Таму мы гатовы з вамі тут працаваць разам. Думаю, мы можам нешта запазычыць адзін у аднаго і ў абнаўленні машынна-трактарнага парка, развіцці сельскіх паселішчаў, аграрнай навуцы. Але самае галоўнае — разам мы можам прыйсці да нейкіх новых адкрыццяў, вынікаў, — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Калі Курганская вобласць жадае з намі ў гэтым плане супрацоўнічаць і азнаёміцца з нашай аграрнай навукай, метадамі, структурай, сістэмай, якая ў нас існуе, мы гатовы вам, як родным людзям, паказаць усё, чаго мы дасягнулі».

Яшчэ адным перспектыўным напрамкам супрацоўніцтва, паводле слоў Прэзідэнта, можа быць узаемадзеянне будаўнічых арганізацый. «Калі трэба і ў вас ёсць свабодныя заказы, мы можам аказаць вам падтрымку ў будаўніцтве. Вядома, пажадана (калі гэта гарадское будаўніцтва), каб вы нам квартал выдзелілі і мы пабудавалі яго як беларускі квартал і пад ключ. Калі гэта прамысловыя прадпрыемствы ці аграрныя, мы таксама хацелі б іх будаваць пад ключ. Гатовы рэалізаваць любы заказ — або самі, або разам з вашымі будаўнікамі», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.

Беларусь таксама гатова развіваць супрацоўніцтва з Курганскай вобласцю ў сферы прамысловай кааперацыі, стварэння сумесных прадпрыемстваў на тэрыторыі любога з бакоў. «Калі будуць якія-небудзь прапановы з вашага боку, мы будзем толькі ўдзячныя. Думаю, што мы на іх можам адказаць адразу ж у ходзе вашага візіту. Калі спатрэбіцца канкрэтызацыя і прапрацоўка, абавязкова гэта зробім», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт заўважыў, што чакае ад гэтай сустрэчы канкрэтных рашэнняў. Для гэтага неабходна вызначыцца як мінімум з некалькімі праектамі, якія можна хутка рэалізаваць. «Чым раней мы нешта зробім, тым лепш будзе для ўсіх. Таму мы гатовы да вельмі аператыўнай работы разам з вамі на карысць нашых рэгіёнаў», — сказаў на заканчэнне беларускі лідар.

■ Парламенцкі дзённік

# Для плённай работы ўсё гатова

## Палата прадстаўнікоў абрала новага віцэ-спікера і старшынь пастаянных камісій

**Учора новаабраныя дэпутаты працягнулі вырашэнне арганізацыйных пытанняў. Яны выбралі намесніка старшыні ніжняй палаты — ім стаў дэпутат Баляслаў Пірштук — і кіраўнікоў пастаянных камісій.**

### АДКАЗНЫ ЗА МІЖПАРЛАМЕНЦКІ СКЛАДНІК

**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, старшыня Палаты прадстаўнікоў,** прапанаваў на пасаду віцэ-спікера кандыдатуру дэпутата Баляслава Пірштука, экс-намесніка старшыні Гомельскага аблвыканкама.

— Эфектыўнасць работы і аўтарытэт Палаты прадстаўнікоў у многім залежаць ад апарату, якаснага разгляду пытанняў, што адносяцца да кампетэнцыі намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў, — заявіў спікер ніжняй палаты. — Гэта, у першую чаргу, каардынацыя заканатворчай дзейнасці пастаянных камісій, міжпарламенцкае супрацоўніцтва, арганізацыя работы Палаты прадстаўнікоў са сродкамі масавай інфармацыі — гэта ўсё функцыі намесніка старшыні.

Баляслаў Пірштук — дэпутат ад Рэчыцкай выбарчай акругі №44. Ён у свой час быў намеснікам старшыні Светлагорскага райвыканкама, потым — старшынёй Светлагорскага райвыканкама, у апошнія гады курыраваў у Гомельскай вобласці пытанні эканомікі, статыстыкі, навукі і інавацый, банкаўскай дзейнасці і развіцця прамысловасці.

### ВЫБАРШЧЫКІ ЧАКАЮЦЬ ЭФЕКТЫЎНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

**Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў,** адказваючы на пытанні журналістаў пра прыярытэты ў сваёй новай рабоце, паведаміў, што першая яго мэта як віцэ-спікера — захаваць тыя традыцыі, якія былі устаноўлены да яго.

— І, безумоўна, арганізаваць новы дэпутацкі склад на актыўную працу, — дадаў віцэ-спікер. — Цяпер дастаткова напружаны час, рэальны сектар эканомікі і насельніцтва чакаюць ад нас эфектыўных дзеянняў. Перш за ўсё я маю на ўвазе эканоміку, бо ўсё залежыць ад яе. Вельмі важна, каб галоўны заканадаўчы орган аператыўна рэагаваў на сучасныя выклікі, ствараў умовы для развіцця эканомікі і, натуральна, мы проста абавязаны вярнуцца на той узровень, які мела краіна два гады таму.

### ПЕРАЕМНАСЦЬ І НАВІЗНА

Пасля таго, як быў абраны віцэ-спікер, пачалася працэдура вылучэння старшынь пастаянных камісій. У выніку дастаткова працяглай працэдуры вылучэння кандыдатур адказнымі пасады былі размеркаваны наступным чынам.

**Пастаянную камісію па заканадаўстве ўзначаліла Наталля ГУЙВІК,** якая была членам гэтай камісіі ў пятым скліканні. Наталля Гуйвік, дэпутат ад Полацкай выбарчай акругі №27, — прафесійны юрыст, больш за 10 гадоў працавала суддзёй. Дэпутат з'яўляецца адным з аўтараў Закона «Аб медыяцыі».

**Старшынёй Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце стаў Леанід ЦУПРЫК,** дэпутат ад Баранавіцкай сельскай выбарчай акругі №7, які да свайго абрання займаў пасаду намесніка старшыні Брэсцкага аблвыканкама.

**Дэпутат Валянцін МІХНЕВІЧ ад Дзятлаўскай выбарчай акругі №56** узначаліў **Пастаянную камісію па нацыянальнай бяспецы.** У свой час парламентарый прайшоў у органах унутраных спраў літаральна ўсе ступені прафесійнага росту, узначальваў Партызанскі і Маскоўскі РАУС сталіцы, займаў пасаду першага намесніка міністра ўнутраных спраў — начальніка крымінальнай міліцыі.

**Пастаянную камісію па эканамічнай палітыцы ўзначаліў дэпутат ад Рагачоўскай выбарчай акругі №45 Уладзіслаў ШЧЭПАЎ,** які ў Палаце прадстаўнікоў пятага склікання працаваў у гэтай жа камісіі намеснікам старшыні.

**Людміла ДАБРЫНІНА, дэпутат ад Аршанскай гарадской выбарчай акругі №25,** абрана старшынёй Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах — гэтую ж пасаду яна займала ў Палаце прадстаўнікоў пятага склікання.

**Старшынёй Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы дэпутаты абралі Яўгена АДАМЕНКУ,** які вылучаўся па Калінкавіцкай выбарчай акрузе №41. За гады работы ён прайшоў шлях ад інжынера-электрыка да кіраўніка прадпрыемства. У свой час узначальваў Калінкавіцкі, Мазырскі раённыя выканаўчыя камітэты Гомельскай вобласці.

**Пастаянную камісію па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы ўзначаліла дэпутат ад Быхаўскай выбарчай акругі №81 Таццяна КАНАНЧУК,** у гэтай жа камісіі дэпутат працавала і ў мінулым скліканні.

**Дэпутат па Лідскай выбарчай акрузе №55 Андрэй НАУМОВІЧ** другі раз стаў старшынёй Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі.

**Ігар МАРЗАЛЮК, дэпутат ад Магілёўскай-Ленінскай выбарчай акругі №84 узначаліў Пастаянную камісію па адукацыі, культуры і навуцы.** Дагэтуль ён быў членам Савета Рэспублікі пятага склікання, дзе працаваў у Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. Ігар Марзалюк — доктар гістарычных навук, прафесар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Старшынёй Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльнай абароне стала дэпутат ад Барысаўскай сельскай выбарчай акругі №63 Тамара КРАСОЎСКАЯ,** якая ў Палаце прадстаўнікоў пятага склікання працавала ў Пастаяннай камісіі па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ.

**Людміла МАКАРЫНА-КІБАК, дэпутат ад сталічнай Грушаўскай выбарчай акругі №99, узначаліла Пастаянную камісію па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы.** Дагэтуль яна ўзначальвала Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр оталарынгалогіі, з'яўляецца галоўным оталарынголагам краіны.

**Андрэй РЫБАК, дэпутат ад Салігорскай гарадской выбарчай акругі №68, стаў старшынёй Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі.** Раней працаваў на «Беларуськаліі», дзе прайшоў шлях ад слесара да намесніка генеральнага дырэктара.

**Пастаянную камісію па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве ўзначаліў дэпутат ад Днепра-Бугскай выбарчай акругі №10 Юрый ДАРАГАКУПЕЦ,** які ў мінулым скліканні працаваў у гэтай жа камісіі. У свой час парламентарый працаваў у сферы жыллёва-камунальнай гаспадаркі — быў дырэктарам прадпрыемства ЖКГ горада Іванава.

**На пасаду старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах дэпутаты абралі Валерыя ВАРАНЕЦКАГА,** які раней займаў пасаду Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла нашай краіны ў Аўстрыйскай Рэспубліцы, быў начальнікам упраўлення знешняй палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by* ■

# СТАНДАРТЫ СТВАРАЮЦЬ ДАВЕР

## Пад такім дэвізам праходзяць Сусветны дзень стандартызацыі і Дзень стандартызацыі ў Беларусі

**Стандартызацыя мае вялікае значэнне для развіцця эканомікі і сацыяльнай сферы любой краіны, садзейнічае выпуску бяспечнай і якаснай прадукцыі, павышэнню яе тэхнічнага ўзроўню і канкурэнтаздольнасці, эканоміі рэсурсаў, ліквідацыі тэхнічных бар'ераў у гандлі.**




Як адзначылі ў Дзяржстандарце, сёння ў краіне ў гэтай сферы дзейнасці фарміруецца новая заканадаўчая аснова, якая ўлічвае нормы Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе (ЕАЭС), назапашаную праваправымяняльную практыку, падтрымлівае развіццё айчыннай прамысловасці і бізнесу, забяспечвае збалансаваныя інтарэсы ўсіх зацікаўленых бакоў. Новыя праекты законаў аб тэхнічным нармаванні і стандартызацыі, ацэнцы адпаведнасці і акрэдытацыі ўжо адобраны Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

У 2016 годзе ў Беларусі былі прыняты шэраг дзяржаўных стандартаў у машынабудаванні, электратэхніцы, радыёэлектроніцы і сувязі, хіміі і нафтахіміі, будаўнічай індустрыі, харчовым сектары.

Узровень гарманізацыі прынятых дзяржаўных стандартаў з міжнароднымі і еўрапейскімі патрабаваннямі перавышае 50%. У Дзяржстандарце падкрэслілі, што паслядоўная работа па выкарыстанні міжнародных і еўрапейскіх стандартаў дае магчымасць краіне своечасова далучацца да агульнай базы нормаў, якія ўжываюцца на розных рынках, і забяспечваць давер да айчыннай прадукцыі. Пры гэтым істотна эканомяцца выдаткі прамысловасці і бізнесу на ажыццяўленне экспартных паставак, хутчэй з'яўляюцца на рынку інавацыйныя вырабы, пашыраюцца магчымасці для ўдзелу ў рэалізацыі інвестыцыйных праектаў.

Калі гаварыць аб распрацоўцы стандартаў, у 2016 годзе ажыццяўляецца работа больш чым па 340 тэмах у адпаведнасці з Планам дзяржаўнай стандартызацыі. У ліку асноўных тэм — аграпрамысловы комплекс, машынабудаванне, электратэхніка і прыборабудаванне, энергаэфектыўнасць і рэсурсазберажэнне, хімія, лёгкая прамысловасць.

У Дзяржстандарце падкрэслілі, што з развіццём працэсаў еўразійскай інтэграцыі, адным з ключавых інструментаў якой прызнаны тэхнічныя рэгламенты, што вызначаюць адзіныя абавязковыя патрабаванні да прадукцыі і правілы яе доступу на агульны рынак, істотна ўзрос аб'ём распрацовак і прыняцця міждзяржаўных стандартаў (ДАСТ). Менавіта гэтыя дакументы забяспечваюць рэалізацыю тэхнічных рэгламентаў ЕАЭС (Мытнага саюза) і адначасова ствараюць аснову для ўзаемнага гандлю ў рамках СНД.

Ужо сёння ўступілі ў сілу 35 тэхнічных рэгламентаў Мытнага саюза, у распрацоўцы знаходзіцца 21 рэгламент, у 18 уносяцца змены.

Для выканання патрабаванняў прынятых тэхнічных рэгламентаў ужываецца больш за 10 000 ДАСТаў, якія вызначаюць патрабаванні да прадукцыі і метады яе выпрабаванняў. Але гэтага яўна недастаткова, таму краіны ЕАЭС, у тым ліку і Рэспубліка Беларусь, занятыя распрацоўкай новых стандартаў і актуалізацыяй састарэлых нормаў.

Дзяржстандарт Рэспублікі Беларусь і ў далейшым працягне займаць актыўныя і ўплывовыя пазіцыі ў сферы тэхнічнага рэгулявання не толькі ў нашай краіне, але і ў рамках інтэграцыйных утварэнняў, інвестуючы пры гэтым у доўгатэрміновае развіццё інстытутаў нацыянальнай стандартызацыі, метралогіі, акрэдытацыі і пацвярджэння адпаведнасці як асновы працэсу павышэння канкурэнтаздольнасці эканомікі дзяржавы.

**Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ.**

■ Сувязі

# ЛІТАРАТУРНАЕ ПАБРАЦІМСТВА

**Сёння ў Маскве ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі праходзіць з'езд Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.**

Творчае грамадскае аб'яднанне створана па ініцыятыве Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Расіі. Старшыня СПБ Мікалай Чаргінец наступным чынам каментуе і само правядзенне з'езда, і вартасці дадзенай пісьменніцкай арганізацыі:

— Адным з прыярытэтаў увогуле ў дзейнасці Саюза пісьменнікаў Беларусі, у літаратурна-грамадскім жыцці нашай краіны з'яўляецца развіццё, умацаванне стасункаў з Расійскай Федэрацыяй, расійскімі калегамі. У нас — беларусаў і расіян — шмат непадзельнага, агульнага. І якраз гэта патрабуе асаблівай увагі. Павінен нагадаць, што ля вытокаў заснавання Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы поруч з Валерыем Ганічавым былі празаікі і паэты, першаадкрывальнікі многіх тэм у сучаснай літаратуры Валянцін Распуцін, Генадзь Іваноў, Мікалай Іваноў, Станіслаў Куняеў, Аляксандр Казінцаў, Альберт Ліханаў... Пагадзіцеся, імёны знакавыя. У свой час мы выдалі кнігу апавяданняў Валянціна Распуціна. Ведаюць яго ў Беларусі і па перакладах на беларускую мову. Альберт Ліханаў нядаўна прадстаўлены ў Беларусі кнігай аповесцяў, таксама — у перакладзе на беларускую мову. Спадзяюся, што яшчэ шмат будзе зроблена для пашырэння беларуска-расійскага літаратурнага пабрацімства. У СПБ — моцныя сувязі з пісьменніцкімі арганізацыямі расійскіх рэгіёнаў. Найперш — Калінінградскай, Белгародскай, Новасібірскай, Цюменскай абласцей, Дагестана, Татарстана... Шмат у гэтым плане робіцца пісьменніцкімі арганізацыямі Мінска, Гомельскай вобласці. Магу толькі падзякаваць за безліч ініцыятыў, якія вылучаюць нашы паэты, празаікі, перакладчыкі на чале з Міхасём Пазняковым, Уладзімірам Гаўрыловічам. Адметна і тое, што расійскія пісьменнікі — частыя госці ў Мінску, у Беларусі. А шмат хто з літаратараў Расіі з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі — Іван Сабіла, Любоў Турбіна, Валерый Казакоў, Алесь Кажадуб... Веру, што і ў выніку чарговага з'езда Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі будзе ажыццёўлена шмат новых творчых праектаў. І несумненным падаецца тое, што ўсе яны будуць скіраваны на падтрымку беларуска-расійскіх міждзяржаўных адносін, на падтрымку таго вектара інтэграцыйнай палітыкі, які не аднойчы быў агучаны нашым Прэзідэнтам — Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам.

**Сяргей ШЫЧКО**

■

**Прывітанне дэлегатам і ўдзельнікам II з'езда Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, паведаміла прэс-служба кіраўніка дзяржавы.**

*«Вы ўзялі на сябе высакародную місію — садзейнічаць умацаванню дружбы і ўзаемаразумення паміж народамі Беларусі і Расіі, працаваць над пабудовай агульнай культурнай прасторы, адстойваць высокія эстэтычныя і маральныя ідэалы», — гаворыцца ў прывітанні.*

*Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што на рахунку Саюза некалькі паспяховых сумесных праектаў. «Дзякуючы вашым намаганням пераклады найлепшых твораў сучасных беларускіх аўтараў рэгулярна з'яўляюцца на старонках расійскіх выданняў, а беларускія чытачы маюць магчымасць знаёміцца з творчасцю рускіх паэтаў, празаікаў, публіцыстаў», — звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы.*

*Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што дзейнасць Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы і надалей будзе садзейнічаць развіццю і ўзаемаабагачэнню беларускай і рускай літаратуры.*

■ Працэс пайшоў

# ДАРОЖНАЯ КАРТА ДЛЯ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ

## Уступленне нашай краіны ў Балонскі працэс — не фармальны акт

**Толькі касметычным рэфармаваннем вышэйшай школы нам не абысціся, калі мы і сапраўды збіраемся ўліцца ў агульнаеўрапейскую адукацыйную прастору. Гэта галоўная думка, якая прагучала падчас рэспубліканскага «круглага стала» з удзелам кіраўнікоў Міністэрства адукацыі і прадстаўнікоў вышэйшых навучальных устаноў.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Нагадаем, што заяўка Беларусі на яе ўключэнне ў Балонскі працэс была ўхвалена ў маі 2015 года.

— Гэта важны і адказны крок, які ставіць перад намі велізарныя задачы па развіцці і абнаўленні нацыянальнай сістэмы адукацыі, — упэўнены **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**. — Умовай нашага ўваходжання ў еўрапейскую прастору вышэйшай адукацыі з'яўляецца выкананне дарожнай карты.

— Мы ўсе баімся перамен, але хочам мы гэтага ці не — перамены ў сістэме адукацыі проста неабходныя. Балонскі працэс — якраз адзін з інструментаў такіх перамен, — падкрэслівае **рэктар прыватнай установы адукацыі «БІП-Інстытут правазнаўства» Сяргей РАМАНЮК**. — Абмяркоўваць, што ў Балонскім працэсе добра, а што дрэнна, трэба было два, тры ці пяць гадоў таму, а калі мы ўжо далучыліся, то давайце разам думаць, як нам паспяхова пераадолець тыя цяжкасці, якія непазбежна цягнуць за сабой любыя перамены.

Балонскі працэс — гэта працэс гарманізацыі еўрапейскай прасторы вышэйшай адукацыі (ЕПВА). Ён уключае стварэнне сістэмы зразумелых усім і супастаўных ступеняў (кваліфікацый), агульнай сістэмы вымярэння заліковых адзінак навучання («крэдытаў»), садзейнічанне акадэмічнай мабільнасці і еўрапейскаму супрацоўніцтву ў забеспячэнні якасці адукацыі. Балонскі працэс стварае спрыяльныя ўмовы для максімальна спрошчанага перамяшчэння студэнтаў і ўладальнікаў дыпломаў у межах агульнай адукацыйнай прасторы, спрашчае ўзаемнае прызнанне кваліфікацый і адпаведных дакументаў аб вышэйшай адукацыі, спрыяе ўзаемадзеянню паміж ВНУ ў адукацыйнай і даследчай дзейнасці і іншае.

Адзін з асноўных выклікаў у сферы адукацыі, з якім сутыкнуліся ўсе краіны ў другой палове XX стагоддзя, — пераход да масавай вышэйшай адукацыі, лічыць Міхаіл Жураўкоў. За гэты адрэзак часу колькасць студэнтаў павялічылася ў свеце з 13 да 82 мільёнаў! З аднаго боку, гэта аб'ектыўны працэс, бо без вышэйшай адукацыі стабільнае развіццё ў сучасным грамадстве не ўяўляецца магчымым. Але, з іншага боку, такая масавасць стварыла мноства праблем: з фінансаваннем вышэйшай школы, якасцю адукацыі, працаўладкаваннем выпускнікоў і многія іншыя.

Дарожная карта ўяўляе сабой графік канкрэтных дзеянняў, якіх чакаюць ад Беларусі да 2018 года. Сярод іх — структурныя рэформы (стварэнне нацыянальнай рамкі кваліфікацый па стандартах ЕПВА, укараненне крэдытнай сістэмы вымярэння курсаў), забеспячэнне мабільнасці студэнтаў і выкладчыкаў і фундаментальных каштоўнасцяў ЕПВА: акадэмічнай свабоды і аўтаноміі ўніверсітэтаў.

— Сёння студэнты ўсё часцей прыцягваюцца да абмеркавання якасці адукацыі, але не будзем хаваць: пакуль што далёка не ў кожнай ВНУ яны сталі сур'ёзнай сілай. Некаторыя ўніверсітэты яшчэ не выраслі «з кароткіх штонікаў», і іх кіраўніцтва не жадае бачыць у сваіх студэнтах сур'ёзных партнёраў у пытаннях арганізацыі навучальнага працэсу, — канстатаваў Міхаіл Жураўкоў.

**Першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ** расказаў, што ў новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі будзе замацавана шматступеньчатасць вышэйшай школы, а таксама магчымасць для арганізацыі новых формаў адукацыйнага працэсу, такіх, як дыстанцыйнае навучанне і сеткавае ўзаемадзеянне.

Цяпер у беларускіх ВНУ — занадта шырокі спектр спецыяльнасцяў і спецыялізацый: на першай ступені — каля 400 і больш як тысяча спецыялізацый і каля 300 спецыяльнасцяў прапануюць у магістратуры. Натуральна, што структура вышэйшай адукацыі павінна быць аптымізаваная. І адно з галоўных патрабаванняў дарожнай карты — стварэнне Нацыянальнай рамкі кваліфікацый.

У новым агульнадзяржаўным класіфікатары «Спецыяльнасці і кваліфікацыі», работу над якім плануецца завяршыць да канца бягучага года, агульная колькасць спецыяльнасцяў вышэйшай адукацыі скарачаецца па асобных кірунках на 35-40%. Вылучаюцца 10 профіляў адукацыі, 26 кірункаў і 72 групы спецыяльнасцяў.

Вадзім Богуш расказаў, што прадугледжваюцца некалькі тыпаў праграм для бакалаўрыята. Іх працягласць будзе вар'іравацца ў залежнасці ад спецыяльнасці. Будуць дзейнічаць і трохгадовыя праграмы бакалаўрыята для выпускнікоў ССНУ (180 заліковых адзінак навучання), і чатырохгадовыя (240 заліковых адзінак), і праграмы з тэрмінам навучання 4,5 года (270 заліковых адзінак).

У магістратуры тэрмін навучання складзе ад года да двух (за магістарскія праграмы будуць налічвацца ад 60 да 120 заліковых адзінак). Але самае галоўнае, што прадугледжваецца істотнае пашырэнне акадэмічнай аўтаномнасці ВНУ за кошт пераходу ад тыпавой вучэбна-праграмнай дакументацыі да прыкладной. Абавязковы кампанент, зафіксаваны па ўзроўні адукацыйнага стандарту, будзе складаць у адукацыйных праграмах бакалаўрыята да 50 працэнтаў. Астатнія 50 працэнтаў зместу будуць фарміраваць непасрэдна ВНУ з улікам тых задач, якія яны вырашаюць ва ўзаемадзеянні з заказчыкамі кадраў.

— Гэта нетрывіяльная задача для ўніверсітэтаў, і нам яшчэ трэба будзе правесці з імі вялікую работу, — канстатуе Вадзім Богуш. — А ў магістарскіх адукацыйных праграмах на ўзроўні стандарту будзе фіксавацца і ўвогуле толькі 30 працэнтаў іх напаўнення, а 70% — аддаецца ВНУ.

— Можа, камусьці падаецца, што мы рухаемся па дарожнай карце не так дынамічна, як бы многім хацелася, але я ўпэўнены, што ў такіх пытаннях трэба дзейнічаць перакананнямі і аргументамі, а не заклікамі і ціскам. Мы не павінны спяшацца, бо дапушчаныя ў сферы адукацыі памылкі могуць пацягнуць вельмі сур'ёзныя наступствы не толькі для тых, хто вучыцца, але і для ўсёй краіны, — упэўнены Міхаіл Жураўкоў. — Не павінны страціць тое лепшае, што маем. У аснову ўсяго трэба ставіць найперш інтарэсы нашай дзяржавы і нашай эканомікі, але арыентавацца пры гэтым на агульнаеўрапейскія і сусветныя тэндэнцыі развіцця адукацыі. З агульнай адукацыйнай прасторы нам нельга выпадаць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*nikalaeva@zviazda.by*

■

## ПРАМЫ ДЫЯЛОГ

**Кіраўнікі мясцовай, раённай і абласной улады 15 кастрычніка зноў прымуць званкі ад жыхароў краіны. Людзі змогуць падзяліцца сваімі праблемамі і задаць пытанні. З 9.00 да 12.00 на званкі будуць адказваць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў КЛІЧКОЎСКАЯ Алена Уладзіміраўна (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
старшыня абласнога Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ЛАПЦЕЎ Віктар Сяргеевіч (80172224444).


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи, ул. Тельмана, 100** |

**Предмет аукциона**

**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу Брестская обл., г. Барановичи, ул. Тельмана, 100/1**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Контора гаражного хозяйства** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 893,8 кв.м | 110/С-6935 |
| **Асфальтовое покрытие территории** | Сооружение специализированное транспорта | 6851 кв.м | 110/С-112512 |

| | |
|---|---|
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок с кадастровым номером 141000000001004013, общ. пл. 0,8198 га, предоставлен на праве постоянного пользования для обслуживания здания конторы гаражного хозяйства |
| **Обременения** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона **www.cpo.by** |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **449 406,14 белорусских рублей (BYN)<br>4 494 061 400 белорусских рублей (BYR)** |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с № 3012343260010 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **5** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **15.11.2016 в 14.00 по адресу: г. Барановичи, ул. Тельмана, 100, актовый зал, ОАО «Грузовой автомобильный парк № 4» г. Барановичи** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **14.11.2016 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

# «Я НЕ ПРАШУ ШЫКОЎНАСЦІ, ЗГОДНА НА КАЛЯСАЧНУЮ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Калі жанчына была ў другім дэкрэтным водпуску, прадпрыемства прапанавала ёй пабудавацца ў мікрараёне Лошыца. Сям'я сабрала неабходныя дакументы. Але кватэру так і не атрымала: аддалі шматдзетным. Пасля, прыгадвае Любоў Станіславаўна, яна даведалася, што пабудаваліся людзі, якія сталі на чаргу пазней за іх. Аказваецца, у калектыўным дагаворы было прапісана, што работнікам, у якіх ЖЭС мае асаблівую патрэбу, жыллё могуць выдзеліць раней.

— Ну добра, я — прыбіральшчыца, але ж мой муж на той момант быў ужо дырэктарам ЖЭСа. Пытаюся, чаму яму не даюць будавацца? Мне кажуць: а ён не прасіў! Як не прасіў, мы ж стаім на чарзе? У ЖРЭА ведалі, што мы жывём у калясачнай і выхоўваем дваіх малых...

Пераехаць з той калясачнай прымусілі абставіны. Калі Любоў Станіславаўна пасля другога водпуску па доглядзе за дзіцем выйшла на працу (на пасаду майстра), забіраць малодшую дачку з садка давялося старэйшай. Сама яна проста не паспявала пасля работы. А муж... Той загуляў, сышоў да іншай жанчыны (цяпер Любоў Станіславаўна з ім у разводзе). У садку папярэдзілі: калі дзіця будзе забіраць дзіця, ні да чаго добрага гэта не прывядзе, давядзецца куды-небудзь паведаміць.



**«Мне кажуць: а навошта ты ішла ў гэту кватэру, калі разумела, што засяляюць неафіцыйна? А што мне было рабіць? Не на прыпынку ж з дзецьмі сядзець».**

— Расказала пра сваю праблему на рабоце. Прасіла знайсці іншае жыллё, якое было б бліжэй да работы і садка.

Праз нейкі час мяне выклікаюць і кажуць: «Ёсць кватэра на вуліцы Прушынскіх, пойдзеш?

Ведаеце, мы заўсёды ішлі не глядзячы.

## «ЛЮБА, ЦЯБЕ ПАДМАНВАЮЦЬ»

У кватэру Любоў Станіславаўна засялілася ў лістападзе 2013 года. Неафіцыйна. А праз паўгода з праверкай нечакана з'явіўся АБЭЗ.

Пачаўся разбор. На двух дырэктараў ЖРЭА Ленінскага раёна сталіцы завялі крымінальныя справы. ЖРЭА ў сваю чаргу падало іскі аб высяленні сям'і.

— Яны сцвярджаюць, што мы самавольна занялі памяшканні. Ну як гэта магчыма? Што я, дзверы зламала ці рашоткі на вокнах пераграызла? — здзіўляецца Любоў Станіславаўна.

Акрамя таго, што сям'і трэба пакінуць кватэру, з жанчыны яшчэ збіраюцца спагнаць суму за беспадстаўнае абагачэнне, паколькі ўвесь час, што яна жыла ў тым памяшканні, яна не аплачвала камунальныя паслугі. Вярнуць неабходна амаль 2,5 тысячы рублёў.

Суды зацягнуліся на два гады. Увесь гэты час Любоў Станіславаўна спадзявалася, што прадпрыемства падшукае ёй іншае памяшканне.

— Мне абяцалі: «Вядома, на вуліцу не выселім». Я не прасіла шыкоўнасці, згодна была на калясачную... А потым са ЖРЭА патэлефанавала мая куратар і сказала: «Люба, яны цябе проста падманваюць. Чакаюць, калі да цябе прыйдуць прыставы і выганяць на вуліцу». Я пайшла па інстанцыях. Нідзе не могуць дапамагчы. У раённай адміністрацыі сказалі, каб шукала месца працы з інтэрнатам, маўляў, ніхто табе нічога не вінен... *(Суразмоўніца, якая дагэтуль старалася трымаць сябе ў руках, расплакалася.)* У мяне ад гэтай сітуацыі псарыяз ужо палез. Здароўем не магу заняцца. Выбілася з сіл...

Улетку жанчына ўсё ж такі звольнілася. Уладкавалася прадаўцом на Мінскі мясакамбінат. Там абяцаюць даць месца ў інтэрнаце. Але ж на прадпрыемстве свая чарга, і перад жанчынай у спісе — яшчэ 12 сем'яў.

— На апошнім судзе думала, што дадуць адтэрміноўку, дазволяць дажыць у гэтай кватэры, пакуль не атрымаю пакой у інтэрнаце. Адмовілі, сказалі: «Вы павінны былі штосьці знайсці». Зняць кватэру я не магу. Заробак — 400 рублёў, аліменты — 200. Толькі на школьнае харчаванне ў месяц ідзе 100 рублёў. У Мінску няма родных, каб хаця часова ў кагосьці пажыць.

Паехаць жыць па месцы прапіскі не варыянт — Любоў Станіславаўна зарэгістравана ў Заводскім раёне ў кватэры старонніх людзей. У брата ці сястры (адзін жыве ў Магілёве, другая — у Гомелі) з пэўных прычын таксама спыніцца не можа. Вярнуцца ўчацвярых у сваю вёску (жанчына родам з мястэчка Чапары Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці)? Гэта не так проста, бо трэба дагледзець 80-гадовую маці пасля інфаркту (а ў горадзе ўзровень медыцынскай дапамогі вышэйшы), дый дочкі тут ходзяць у школу.

— Ведаеце, малодшая прыстасавалася б. А старэйшую шкада. Яна ў гімназіі вучыцца ў дзявятым класе, там французская мова. А ў сельскай школе што? Тым больш экзамены ў гэтым годзе. Калі б магла, пакінула б старэйшую дачку з татам, а сама паехала б у вёску з маленькай. Але муж з намі не падтрымлівае адносіны ўжо тры гады. Дні нараджэння ў дзяўчат былі — нават эсэмэскі не дасылаў. Старэйшая дык крыўдуе, — на вачах жанчыны зноў з'яўляюцца слёзы.

У чарговы раз суразмоўніца перабірае дакументы, што назбіраліся ў яе за час судоў, — іскі, папярэджанні, адказы на звароты. Быццам спрабуе знайсці зачэпку, якая дапаможа ёй выйграць гэту практычна безнадзейную справу.

— Б'ёмся самі. Мне кажуць: а навошта ты ішла ў гэту кватэру, калі разумела, што засяляюць неафіцыйна? А што мне было рабіць? Не на прыпынку ж з дзецьмі сядзець. Чаму за парушэнні службовых асоб павінны цярпець іх работнікі?

## «УСЕ ІДУЦЬ НАСУСТРАЧ»

Па падрабязнасці мы звярнуліся ў ЖРЭА Ленінскага раёна Мінска, якое з'яўляецца істцом па гэтай справе. Там заявілі, што сітуацыя складаная, суд канчатковае рашэнне яшчэ не прыняў. Як так аказалася, што іх работніца Любоў Станіславаўна неафіцыйна жыве ў кватэры і мае ключы ад яе — каментаваць не сталі. Але на некаторыя пытанні ўсё ж адказалі.

— Няпраўда, што мы не спрабавалі падабраць для майстра Марфель іншае памяшканне, — сцвярджае **намеснік дырэктара ЖРЭА па ідэалагічнай рабоце і агульных пытаннях Андрэй НОВІК**. — Мы падавалі хадайніцтва ў адміністрацыю Ленінскага раёна з просьбай прадаставіць жыллё ёй, яе маці 1936 года нараджэння і двум непаўналетнім дзецям. Адміністрацыя шукала месца ва ўсіх інтэрнатах раёна, але вольных пакояў няма. Пісалі ў адміністрацыю Партызанскага раёна па гэтым жа пытанні, калі жанчына збіралася ўладкавацца на Мінскі трактарны завод. Таксама нічога.

Свайго інтэрната ў ЖРЭА няма. Будавацца работнікам прапануюць згодна з чаргой. Але ўжо тры гады ніякіх жылых будынкаў не здавалі.

Андрэй Новік кажа, што ў судзе прыпынялі справу да сёлетняга верасня, каб даць жанчыне час вырашыць сваё жыллёвае пытанне і з'ехаць. Больш зацягваць не могуць: кватэра, якую займае Любоў Станіславаўна, прызначана для пэўных катэгорый грамадзян — сірот, шматдзетных сем'яў.

— Але ж Марфель таксама сярод тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Да таго ж адна выхоўвае дзвюх непаўналетніх дачок.

— Яна стаіць на чарзе ў Заводскім раёне, па месцы прапіскі, а не ў Ленінскім, — тлумачыць Андрэй Новік.

— Усе ішлі былой работніцы насустрач, — запэўнівае намеснік дырэктара ЖРЭА. — Суд пастаянна даваў адтэрміноўкі. Іншыя тры сям'і з гэтага дома, супраць якіх таксама былі пададзены іскі, ужо выселілі. Акрамя таго, хадайніцтва аб прадастаўленні жанчыне і яе сям'і месца ў інтэрнаце цяпер знаходзіцца ў Мінгарвыканкаме.

— Яна павінна разумець: законнага спосабу пакінуць сабе кватэру няма. Шкада дзяцей, але кропку ў гэтай справе ўсё роўна паставіць суд.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by.*

### Афіцыйна

**Закон, на жаль, не на баку Любові Марфель. Падставай для засялення ў кватэру з'яўляецца дагавор найму жылога памяшкання. У жанчыны дакумента не было. Афіцыйна двушка на Прушынскіх, 42 не размеркавана і з'яўляецца вольнай.**

**Патрабаваць іншую кватэру Любоў Станіславаўна таксама не можа. У адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 85 Жыллёвага кодэкса грамадзяне, якія самаўпраўна занялі жылое памяшканне, падлягаюць высяленню ў судовым парадку без прадастаўлення іншага жылля.**

**Пабудавацца па чарзе шанцаў мала. Самі разумееце, сталіца. Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінгарвыканкама Аляксандр АЎРАМЕНКА тлумачыць, што цяпер будаўніцтва прапаноўваюць практычна толькі шматдзетным сем'ям, якія маюць трох і больш непаўналетніх малых і надзелены правам пазачарговага накіравання.**

**Што да высялення з кватэры, то, адказваюць ва ўпраўленні, паколькі гэта пытанне разглядаецца ў судзе, падстаў для ўмяшання ў вырашэнне спрэчкі з боку мясцовых выканаўчых органаў няма.**

■ Права

# МЕДЫЯЦЫЯ ДАПАМАГАЕ ЗАХАВАЦЬ АДНОСІНЫ

**Уладзімір паўгода абіваў парогі судоў, спрабуючы арганізаваць стасункі з сынам і вызначыць месца яго жыхарства з бацькам, а таксама вырашыць пытанне падзелу маёмасці. Пасля першай жа сустрэчы з медыятарам мужчына атрымаў магчымасць бачыцца з малым, а былая жонка адмовілася ад маёмасных прэтэнзій. Цяпер хлопчык праводзіць амаль аднолькава часу і з маці, і з бацькам. І гэта толькі адна гісторыя з сотняў тых, дзе медыятары дапамаглі людзям захаваць нервы і грошы.**

— Зніжэнне нагрузкі на судовую сістэму і магчымасць захаваць пасля медыяцыі канструктыўнае партнёрства ў асабістых і працоўных адносінах — гэта асноўныя перавагі, што нясе ў сабе працэдура медыяцыі, — выказаўся **Алег СЛІЖЭЎСКІ, міністр юстыцыі Беларусі** падчас міжнароднага форуму «Камерцыйная медыяцыя ва Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі».

Гэтай жа думкі прытрымліваюцца і астатнія ўдзельнікі з 11 краін, якія за два дні работы абмеркавалі праблемы, якія існуюць у медыяцыі, спецыфіку работы і шляхі паляпшэння становішча ў медыяцыйнай сферы.

**З 2014 года, калі медыяцыя паўнавартасна запрацавала ў Беларусі, праведзена ўжо больш за 300 працэдур, 117 з якіх скончыліся пагадненнем.**

— Некалькі гадоў таму мы праводзілі падобнае мерапрыемства ў Бішкеку, і супрацоўніцтва, што склалася там, дзейнічае да гэтых часоў, — адзначыў **Мішэль НУСБАЎМЕР, дырэктар праграмы Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця па прававых рэформах**. — Спадзяюся, мінскі форум стане такім жа плённым і мы працягнем рэгіянальны дыялог.

Па выніках з'явіліся пэўныя нарматыўна-прававыя і практычныя рашэнні. Медыятары зразумелі, як ім наладжваць сваю работу далей. Мінюст абазначыў, што яшчэ трэба адкарэкціраваць у існуючым заканадаўстве.

— У нас створаны някепскія ўмовы для развіцця інстытута медыяцыі. Трэба больш практычнай дзейнасці і распаўсюджвання інфармацыі пра гэтую працэдуру, у тым ліку праз сацыяльную рэкламу, — зазначыў Алег Сліжэўскі.

Нізкая інфармаванасць насельніцтва і недавер людзей да працэдуры медыяцыі, звыклая практыка замоўчвання канфліктаў — асноўныя праблемы, што стрымліваюць медыяцыю, адзначалася падчас форуму.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** ОАО «Витебскхлебпром», 210024, г. Витебск, ул. Горбачевского, 5, тел. (0212) 35-86-82

Лот №1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-108266 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Змитрока Бядули 3-я, 27, пом. 39, площадью 174,7 кв.м, наименование: торговое помещение. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 88 000/880 000 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 8 800/88 000 000 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **01.11.2016 г. в 15.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 14.10.2016 с 8.30 по 31.10.2016 г. до 17.30.** Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 10.09.2016

Лот №1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-108263 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 22/2-87, площадью 297,4 кв.м., назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение с рампой. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 304 400 / 3 044 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 30 440 / 304 400 000 бел. руб.

Повторный аукцион состоится **14.11.2016 г. в 11.00** по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: **с 14.10.2016 с 8.30 по 11.11.2016 г. до 17.30.** Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 03.09.2016.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. **Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by**

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
3 БЕЛАРУСЬ
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# «Прывезлі нявесту, як сонца...»



Традыцыйна маладыя падчас вяселля сядзяць на покуці, пад абразамі, г. Вілейка.

## БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ: ТРАДЫЦЫІ І ЗАБАБОНЫ

**Нашы продкі зазвычай ладзілі вяселле ўвосень. Ураджай з поля сабраны, а свойская жывёла ды птушка за лета добра адкормлены. Значыць — вясельны стол будзе багатым. Прайшлі Пакровы, а калядны пост яшчэ не настаў. Таму весяліцца можна — хоць некалькі дзён. Смачна есці, спяваць песні, танцаваць, піць гарэлку...**

**Дарэчы, паводле традыцыі, на вяселлі гарэлкай маглі частавацца толькі госці. Маладым піць забаранялася — каб у будучыні не сталі п'яніцамі. Яшчэ больш пра адметнасці аўтэнтычнага беларускага вяселля на Полаччыне і Вілейшчыне гледачы тэлеканала «Беларусь 3» даведаюцца з праграмы «Наперад у мінулае». Чарговыя «вясельныя» выпускі выйдуць у эфір 16 і 23 кастрычніка, мы ж ужо сёння запрашаем нашых чытачоў разам са здымачнай камандай праекта і карэспандэнтам «Звязды» ў якасці гасцей пабываць на вяселлях у вёсцы Багатырская, што на Полаччыне, і ў горадзе Вілейка.**

### На добры век і здароўе

Вяселле ў традыцыйным стылі (ці хаця б з яго элементамі) — сёння рэч досыць модная. Усё больш маладых людзей імкнецца пабрацца шлюбам не толькі «па правілах», але і згодна з традыцыямі нашых продкаў. Вось і студыя народных традыцый і абрадаў «Краявід», што працуе пры Вілейскім краязнаўчым музеі, прапануе адмысловую паслугу — беларускае вяселле. Усе пажаданні-абрады, з якіх складаецца цырымонія, не выпадковыя. Іх сябры студыі карпатліва адшукалі ў літаратурных крыніцах, запісалі ў экспедыцыях, а мясцовыя спявачкі з задавальненнем вывучылі песні, характэрныя менавіта для Вілейшчыны. А многія з іх жанчынам помняцца яшчэ з маладосці.

**Вясельны каравай нельга падчас свята ламаць, кусаць, даваць частавацца гасцям.**

Так, паводле традыцыі, ля парога хаты, дзе ладзіцца вяселле, маладых сустракаюць хлебам-соллю і пажаданнямі:

— Мы сустракаем вас з хлебам-соллю, а Бог няхай сустракае шчасцем і доляю. Пакланіцеся хлебу — нашаму абярэгу на ўсе вякі, і пацалуйце яго, каб жылі доўга і толькі разам. Будзьце прыгожыя, як ружы, багатыя, як зямля, здаровыя, як вада. Блаславляю вас жытам-бытам — на добры век, на добрае здароўе!

А вось якую песню здаўна спяваюць у Вілейцы, калі маладая разам з маладым заходзяць у хату:

*Лятуць-лятуць два лебедзі цераз сад,*
*Вядуць-вядуць млоду Ніначку*
*на пасад.*
*Яна ж у нас пасадзіку не знала,*
*Яна ў свае роднай мамачкі пытала.*
*Да ад каго, мая мамачка, пасадзік?*
*Да не ад каго, мая дачушка, ад Бога,*
*Да каб не знала пасадзіку другога.*

На стале, за якім сядзяць маладыя, усе прадметы маюць свой сэнс. Чырвонае віно — сімвал кахання, лубка з зернем і грамнічная свечка — абярэг новай сям'і. Здаўна ў беларусаў лічылася, што грамнічная свечка аберагае дом ад маланак, пажараў, таму і сям'ю яна будзе аберагаць ад нястач. Хлеб — сімвал багацця і дабрабыту. Дарэчы, маладым на стол клалі толькі адну лыжку — каб па жыцці яны заўжды ішлі разам.

Таксама на вяселлі маладыя маглі варажыць. Гэта апошні раз, калі дазвалялася дзяўчыне гадаць, каб даведацца пра будучыню сваёй сям'і. Па чарзе маладыя выцягваюць розныя рэчы з лубкі. Кожны з гэтых прадметаў таксама мае свой сэнс. Так, салома прадказвае, што малады будзе руплівы, а не такі гультай, як куль саломы. Лялька абяцае, што ў першы год сумеснага жыцця ў хаце маладых будзе калыхацца калыска. Зерне сведчыць пра дастатак у сям'і, а кветка сімвалізуе моцнае каханне паміж мужам і жонкай. Лыжка сведчыць пра тое, што малады будзе вельмі працавіты, але будзе шмат есці.

### Што за вяселле, калі няма дарэння!

Думаю, многія падчас вяселляў і ў нашы дні чулі жартоўныя пажаданні, якія госці часам кажуць, калі дораць маладым усялякія дробязі. Аказваецца, што такія падарункі рабілі і нашы продкі, суправаджаючы іх пажаданнямі. Так, на Вілейшчыне маладым кажуць:

— Дару вам зялёны ліст, каб нарадзіўся сын-гарманіст. І жадаю вам мець столькі сыноў, колькі ў хаце вуглоў. Дару нітак катушку, каб у сям'і былі і дачушкі. Жадаю мець столькі дачушак, колькі ў хаце падушак. Дару маладому клубок нітак, каб не круціўся ля чужых лытак.

А вось у вёсцы Багатырская, што на Полаччыне, падарункі дораць з такімі словамі:

— Дару вас абразам, каб усё жыццё пражылі разам. Дару вам абрус новы, каб былі ўсе здаровы. Дару маладому абцугі — каб не раслі ў яго рагі. Дару агурочкі, каб раслі ў вас добрыя дочкі, а сыны — як дубочкі. Дару аладкі — каб жонка была гладкай. Дару маладой пацеркі бярозавы — каб мужык заўсёды прыходзіў дамоў цвярозы.



Курыца — сімвалічны пасаг ад хроснай. Гэта пачатак новай гаспадаркі, в. Багатырская.

Вяселле — не проста свята і забава. Гэта яшчэ сімвалічны этап пераходу дзяўчыны ў свет жанчын, нараджэнне новай сям'і. Як заўсёды ў беларусаў, у такія знакавыя моманты павінна было выконвацца мноства правілаў, існавалі і свае забабоны. Так, на Вілейшчыне нам расказалі, што калі маладая першы раз разам заходзіць у хату, то маладая — паколькі яна ў доме новы чалавек — павінна цераз парог пераступіць, або малады мусіць яе перанесці. Нашы продкі лічылі, што пад парогам жывуць духі дома, якія аберагаюць хату. Такім чынам трэба паказаць духам, што маладая — ужо свая ў хаце. Таксама падчас вяселля важна правільна стаяць і сядзець: нявеста мусіць знаходзіцца злева ад жаніха.

**«Дару маладому клубок нітак, каб не круціўся ля чужых лытак».**

Вясельны каравай нельга ламаць, кусаць, даваць частавацца гасцям. Маладыя яму павінны пакланіцца і пацалаваць, бо хлеб — гэта жыццё. З'есці яго можна ўжо пасля вяселля, але толькі мужу і жонцы. Падчас вяселля маладыя гарэлку могуць толькі прыгубіць, яны павінны выліць цэлыя кілішкі цераз левае плячо. Лічылася, што на левым плячы сядзіць чорт-спакуснік, а на правым — анёл-абаронца. Такім сімвалічным жэстам маладыя аддавалі чорту гарэлку, адмаўляліся ад яе і тым самым адганялі спакусніка. Дарэчы, садзіцца на дзяжу (сімвалічны абрад, што мусіць спрыяць нараджэнню дзяцей, узмацненню жаночай сілы) магла толькі нявінная дзяўчына. Калі ж здаралася так, што жанчына выходзіла замуж ужо цяжарная, то ёй нельга было падчас вяселля сядзець на покуці, пад абразамі.

### Лапці для цешчы

На Полаччыне вясельныя традыцыі таксама выконваюцца спрадвек. Іх захавальнікамі ў сучаснасці можна лічыць гурт «Голас спадчыны», што існуе ў вёсцы Багатырская з 1971 года. Дарэчы, маці Веры Пісюковай, заснавальніцы калектыву, была ў маладосці нянькай у дзяцей вядомага мастака Івана Хруцкага. За мілагучны голас ён узяў юную Яўгенію на працу, каб дзяўчына вучыла беларускім песням і яго дзяцей. І менавіта ад маці Вера Уладзіміраўна яшчэ ў дзяцінстве пераняла захапленне фальклорам, стварыла гурт «Голас спадчыны», якім кіравала амаль чатыры дзесяцігоддзі. На жаль, Веры Пісюковай ужо некалькі гадоў няма на гэтым свеце, але яе справа жыве і, спадзяюся, будзе жыць яшчэ доўга.

Старэйшыя ўдзельніцы «Голаса спадчыны» Галіна Бычкова і Ганна Жаркова кажуць, што і падчас іх вяселляў выконваліся мясцовыя традыцыі, разам з песнямі яны ідуць з даўніны. Так, маладая з маладым у суправаджэнні гасцей, спяваючы песні, ідуць да дома маладога. На парозе хлебам-соллю іх сустракаюць маці з бацькам, а госці спяваюць такую песню:

*Адчыні, мамулька, ваконца.*
*Прывезлі нявесту, як сонца.*
*Адчыні, мамулька, новы тын,*
*Прывезлі нявесту, як твой сын.*

Бацькі віншуюць маладых, жадаюць шчасця і здароўя новай сям'і і запрашаюць у хату. Але вяселле не можа пачацца без хроснай маці маладой. Яна выконвае важную ролю ў абрадзе: прыносіць нявесце сімвалічны пасаг — курыцу, якая стане пачаткам новай гаспадаркі маладой сям'і. Пры гэтым прынята курыцу ўсяляк хваліць, захапляцца яе прыгажосцю і казаць, напрыклад, што яна нясе па два яйкі на дзень. І толькі пасля запытання хроснай: «Бацька і маці, дазвольце вяселле пачаці» і іх адказу: «Калі Бог дазваляе, то і мы дазваляем» пачынаецца свята.

Падчас вясельнай бяседы трэба хваліць стравы, прыгатаваныя гаспадынямі, захапляцца прыгажосцю маладых, увесь час зычыць ім шчасця ў сямейным жыцці. Ну і, натуральна, крычаць традыцыйнае «Горка!», а таксама спяваць песні. Напрыклад, вось такую, пра свата:

*А ў нашага свата багатая хата*
*Печка з масла збіта,*
*блінамі накрыта.*
*Блінамі накрыта, сырнікам зашыта.*

**«Дару вам зялёны ліст, каб нарадзіўся сын-гарманіст. І жадаю вам мець столькі сыноў, колькі ў хаце вуглоў».**

Пасля адорвання маладых падарункамі іх запрашаюць да дзяжы. Гэта — пераход маладой у статус жонкі. Хросная кажа:

— Наступіў такі дзень, як панядзелак, і трэба адлучыць цябе ад дзевак.

А заўтра будзе такі дзень, як аўторак, і мы далучаем цябе да жонак.

Вяселле традыцыйна доўжыцца два дні. Гучаць песні, госці танцуюць, весяляцца. На Полаччыне разыгрываюць і вось такую сцэну. Маці маладой кажа, што ёй туфлі нацерлі ногі, але танцаваць вельмі хочацца. Зяця просяць, каб падарыў цешчы лапці і абуў ёй іх. Па тым, як абыходзіцца ў гэты момант зяць з цешчай, меркавалі, што так і будзе ставіцца да сям'і сваёй жонкі. Важна, каб падчас танца цешчы з зяцем лапці не ўпалі з ног.

**Падчас вясельнай бяседы трэба хваліць стравы, прыгатаваныя гаспадынямі, захапляцца прыгажосцю маладых, увесь час зычыць ім шчасця ў сямейным жыцці.**

Святкаванне заканчваецца, калі госці ўжо стаміліся есці, піць, спяваць і танцаваць. Заканчваецца вяселле песняй:

*Пойдзём, госцейкі, дадому.*
*Паелі конікі салому,*
*А каля ракі — буракі,*
*А каля тыну — сноп аўса.*
*Вось калі, госцейкі, свадзьба ўся.*

Сёння мы зазірнём і ў мінскую студыю праекта «Наперад у мінулае», дзе старажытныя вясельныя песні набываюць новае жыццё. Так, «Сізенькі галубчык» з Вілейшчыны падчас праграмы прагучыць у выкананні Віталя Пракаповіча, а новае жыццё застольнай песні з Полаччыны «Гарэлачка мая белачка» падарыў пост-рок гурт Re1ikt. Лідар гэтага калектыву Аляксандр Дземідзенка расказвае:

— Галоўнае, што мы хацелі, — зрабіць песню з гумарыстычным настроем, іранічную. Бо яна выконвалася як жарт. Працаваць было вельмі цікава. Некаторыя ідэі нараджаліся ўжо ў момант запісу (ці то вакальныя інтэрвалы, ці то звон чарак). Спадзяюся, што гэтую песню будзем выконваць на сваіх канцэртах, нам вельмі падабаецца выконваць народныя песні, якія апрацоўваем.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by



Маладыя разам з гасцямі, спяваючы песні, крочаць па вуліцы дахаты, в. Багатырская.

## Субота, 22 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.50** Існасць.
**7.15 Меладрама «Дзённік свекрыві».**
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Буйным планам.
**9.40 Серыял «Сваты-6».**
**11.00** 50 рэцэптаў першага.
**12.10** Дача.
**12.50** Вялікі сэлфі-тур.
**13.25** Трансфармацыя.
**14.05** Здароўе.
**15.15** Краіна.
**15.45 Меладрама «Саната для Веры».**
**19.20, 21.40 Меладрама «Хлусня дзеля выратавання».**
**21.00** Панарама.
**23.20 Камедыя «Клушы».**
**1.15** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05** Сіткам «Розныя». 1-я серыя.
**8.00** «Арол і рэшка. Шопінг». Трэвел-шоу.
**8.55, 20.55** Тэлебарометр.
**9.00 Серыял «Шчаслівыя разам 3».**
**10.35** Выбар гледачоў. Анімацыйны фільм «Артур і помста Урдалака».
**12.15** Капейка ў капейку.
**12.50** «Вялікая ілюзія на Кіпры».
**13.25** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**14.40** «Моду народу».
**15.40** «Бітва экстрасэнсаў. 13-ы сезон».
**17.50** «Сям'я». Рэаліці-шоу.
**19.05** «Здзіві мяне 3». Талент-шоу.
**21.10 Фантастыка «Стартрэк: адплата».**
**22.00** Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**23.40** Хачу ў тэлевізар!
**23.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**

### Беларусь 3

**8.00, 13.55, 16.25, 21.00** Навіны культуры. «Калейдаскоп».
**8.15** Анталогія «Славянскага базару». «Славянскі базар у Віцебску-2003».
**9.10** «Легенды музыкі». Мікаэл Тарывердзіеў.
**9.35, 17.10 «Першая пальчатка». Камедыя.**
**10.55 «Мама, я жывы». Драма.**
**12.00** «Ігар Дабралюбаў з сябрамі». Дак. фільм.
**12.55** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**13.25** «Край».
**14.10** «Заапаркі свету» з Іванам Карнеевым.
**14.35** «Час кіно».
**14.45 «Каралі для маёй каханай». Меладрама.**
**15.55** «Камертон». Рэжысёр, акцёр, сцэнарыст, прадзюсар, народны артыст Расіі Мікіта Міхалкоў.
**16.40** «Навукаманія».
**18.25 «Люстэрка для героя». Драма.**
**20.40** «Калыханка».
**21.20** «Цвярдыні свету». Дак. фільм «Кашмір. Брыльянт мангольскай кароны».
**21.55 «Папярэдняе расследаванне». Прыгоды.**
**23.25** «Бард-парад».

### Беларусь 5

**7.55, 23.05** PRO спорт. Навіны.
**8.05** Плаванне. Этап кубка свету. Сінгапур.
**10.05** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 3-ці тур. Агляд.
**11.00, 17.55** Настольны тэніс. Чэмпіянат Еўропы. Парны разрад. 1/4 фіналу. Мужчыны. Жанчыны.
**12.55** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама» (Маладзечна) — «Шахцёр» (Салігорск).
**15.05** Козел пра футбол.
**15.25** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Іслач» (Мінскі раён) — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
**17.25** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**23.15** Тэніс. Турнір WTA. Кубак Крамля. Фінал.

### АНТ

**7.00** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.05 М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».**
**9.25** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.00** «Ідэальны рамонт».
**12.05** «Разумніцы і разумнікі».
**12.50** Тэлечасопіс «Гумарынка».
**13.00** Да 90-годдзя Спартака Мішуліна. «Саід і Карлсан».
**13.55 Маст. фільм «Забіць Дракона».**
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**17.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўрааптам».
**18.00** «Тэорыя змовы».
**18.50** «Мой бізнес».
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.20** «Усё складзецца».
**23.05** «МаксімМаксім».
**0.10** «Падмаскоўныя вечары».

### СТБ

**6.00 «Неудачников.net». Серыял.**
**7.25** «Анфас».
**7.40 Трагікамедыя «Прахіндзіяда, або Бег на месцы».**
**9.20** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.05** «Ежа багоў».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35 «Дэмбельскі альбом». Серыял.**
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.45, 1.55 Драма «Маці і мачаха».**
**15.15** «Вадзіць па-руску».
**15.50** «Вялікі горад».
**16.40** «Наша справа».
**16.55** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**18.35** «Прагнасць».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Нам і не снілася».
**22.35 «Жаданая». Серыял.**

### МІР

**6.00, 8.20, 4.45** М/ф.
**6.15 Маст. фільм «Пачатак».**
**7.55** «Саюзнікі».
**9.00** «Вой, мамачкі!»
**9.30** «Мой лепшы сябар».
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Здабытак рэспублік».
**10.45 Маст. фільм «Вакзал для дваіх».**
**13.20** «Цяжар абеду».
**13.50 Маст. фільм «Супермозг».**
**16.15 Серыял «Лекі супраць страху», 1—8-я серыі.**
**23.05 Маст. фільм «Цяжка быць мача».**
**1.00 Маст. фільм «Супермозг».**
**3.00 Маст. фільм «Удача напракат».**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.50 Маст. фільм «Адчыніце, гэта я!»**
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20 Камедыя «Іван Броўкін на цаліне».**
**13.10** «Ці цяжка быць Міхалковым?»
**14.20** «Ха». Маленькія камедыі.
**14.45** «Гумар! Гумар! Гумар!»
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55 Маст. фільм «Усміхніся, калі плачуць зоркі».**
**22.35 Маст. фільм «Без права на памылку».**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 8.20 Серыял «Дарожны патруль».**
**8.00, 10.00, 14.00, 16.00** Сёння.
**8.40** «Вуснамі дзіцяці».
**9.25** «Іх норавы».
**10.25** «Галоўная дарога».
**11.05** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.05** «Кватэрнае пытанне».
**13.20** «Удача ў дадатак!»
**14.15** «Паедзем, паядзім!»
**15.05** «Адночы...»
**16.20** НТБ-бачанне. «Куды сыходзіць дзяцінства?»
**17.15** «Следства вялі...»
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**19.55** «Новыя рускія сенсацыі».
**20.50** «Ты не паверыш!»
**21.40 Камедыя «Малавіта».**
**23.35** «Салтыкоў-Шчадрын шоу».

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.05, 21.15, 23.45** «Надвор'е».
**9.05** М/ф.
**9.55 Серыял «Фартыт'юд».**
**10.45** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**10.55 Серыял «Дварцовыя тайны».**
**14.00** «Мультпарад». «Альфа і Амега».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30** Дак. фільм «Маскоўская асада».
**17.20, 19.10, 21.00** «Хатняя крама».
**17.25, 19.15 Серыял «Вяртанне», 1—2-я серыі.**
**20.50** «Вечарніца».
**21.05** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Трылер «Племя ізгояў».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**6.30** «Мой тата круцейшы!»
**7.30, 13.00** «Ералаш».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.15** М/ф «Маша і мядзведзь».
**8.30** М/ф «Гадкае качаня і я».
**9.00** «Новае жыццё».
**10.00, 2.15** «Турбаміксер».
**12.00** Серыял «Сям'я 3D».
**13.00** Серыял «Апошні з Магікян 5».
**15.00** Меладрама «Пенелопа».
**17.00** М/ф «Баранчык Шон».
**18.40** «Ленінградскі Stand-up клуб».
**19.30** «Уральскія пельмені».
**21.00** Фантастыка «Штучны розум».
**0.00** Скетч-шоу «Валера ТБ».
**0.30** Камедыя «Муві 43».
**4.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**5.30** «Лаві момант».

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Забароненая зона». Маст. фільм.
**11.40** Пернікавы домік. «Свет мой, зеркальце».
**12.10** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**12.40** 90 гадоў з дня нараджэння Спартака Мішуліна. «Астравы».
**13.20** Спектаклі-легенды. Спартак Мішулін, Тацяна Пельтцэр, Андрэй Міронаў, Ніна Архіпава ў спектаклі тэатра Сатыры «Маленькія камедыі вялікага дома». Запіс 1974 года.
**16.00, 18.25, 2.40** Сусветныя скарбы.
**16.15** «Гульня ў бісер». «Э. Хэмінгуэй. «Па кім звоніць звон».
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Рамантыка раманса». Рэнат Ібрагімаў.
**18.40** Да 80-годдзя з дня нараджэння Савы Куліш. «Мёртвы сезон». Маст. фільм.
**21.00** Вялікая опера — 2016.
**23.00** «Белая студыя».
**23.40** Кіно на ўсе часы. «У мінулым годзе ў Марыенбадзе». Маст. фільм.
**1.20** «Зніклы аркестр». «Пра ракаў». «Маё жыццё». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Дзе знаходзіцца радзіма Залатога руна?»

### Настальгія

**6.00** «Бітламанія» з Дзмітрыем Дзібровым. 2008 год.
**6.45, 8.40, 9.40, 13.40, 14.45, 15.40, 17.15, 18.40, 20.35, 1.15, 2.45, 3.40** Музычная настальгія.
**7.10** Тэлеспектакль «Як важна быць сур'ёзным».
**8.45** Дак. фільм «Навука і тэхніка».
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».
**10.00, 4.00** «Народжаны ў СССР».
**11.05** Дак. фільм «Старыя майстры».
**12.00** «КВЗ-87». НДУ—ДДУ.
**13.50** Тэлеспектакль «Джэнтльмены, якім не пашанцавала».
**16.00** «Колба часу».
**17.00** «Час пік» з У. Лісцьевым. 1994 год.
**18.00** «Тэма» з У. Лісцьевым: «Праблемы платнай медыцыны». 1992 год.
**19.20** «Зямля—Паветра». «Прэмьер-міністр». 2003 год.
**21.00** «Быў час». 2008 год.
**22.00** Маст. фільм «Мёртвы сезон».
**0.15** «Спяём, сябры!» з Натальляй Казялковай. 2005 год.
**1.05** Дак. фільм «Сумленны фатограф».
**1.30** Маст. фільм «Аповесць пра маладых».
**5.05** «Песня-82». 1-е аддзяленне.

### EuroSport 1

**4.00, 6.30, 9.30, 20.00, 2.30** Веласпорт. Чэмпіянат Еўропы (трэк).
**5.00, 8.00, 12.00** Тэніс. Турнір WTA.
**10.45, 13.00, 18.00, 23.30, 1.45** Горныя лыжы. Кубак свету. Жанчыны.
**15.00, 19.30, 0.45** Веласпорт. «Тур Абу-Дабі».
**16.00** Тэніс. Турнір WTA. Фінал.
**0.00** Аўтаспорт. Суперкубак Porsche.

### Кінакамедыя

**0.45** Камедыя «Школа зладзеяў 2».
**2.30** Камедыя «Няўдачлівыя».
**4.05** Камедыя «Кекс у вялікім горадзе».
**5.45** Камедыя «Шчаслівае сямейства».
**7.15** Камедыя «План «Б».
**9.00** Меладрама «Поспехаў, Чак».



**10.45** Камедыя «Трайныя непрыемнасці».
**12.25** Камедыя «Няголены нянь».
**14.00** Меладрама «Сведка на вяселлі».
**15.45** Скетчкам «Паміж намі».
**16.00** Меладрама «Вельмі моцна заказаны».
**17.45** Камедыя «Усё магу».
**19.20** Баявік «Драконы назаўжды».
**21.00** Камедыя «Кухар на колах».
**22.55** Камедыя «Мытня дае дабро».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00** «Хронікі маскоўскага побыту».
**10.55** «Доказ віны».
**11.30, 1.35** «Цудоўнае стагоддзе». Серыял.
**15.05** «Алёша Паповіч і Тугарын Змей». Анімацыйны фільм.
**16.30** «Зоркі. Тайны. Лёсы».
**17.35** «Алігарх ТБ».
**18.05** «Вакол свету. Мясціны сілы».
**19.05** «Давайце пазнаёмімся». Меладрама.
**21.05** «Без твару». Баявік.
**23.40** «Каліфрэнія». Серыял.
**0.10** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.
**4.40** «Боль». Дак. фільм.

### ТБ1000

**6.10, 18.20** Камедыя «А вось і яна».
**8.10** Трылер «Драйвер на ноч».
**10.10** Драма «Спакуса».
**12.15** Меладрама «Снежаньскія хлопчыкі».
**14.10** Камедыя «Мары здзяйсняюцца!»
**16.10** Трылер «Нічога асабістага».
**20.10** М/ф «Караліна ў Краіне Кашмараў».
**22.10** Трылер «Забі мяне пяшчотна».
**0.10** Фэнтэзі «Буйная рыба».
**2.20** Трылер «Урачысты фінал».
**4.20** Драма «Філамена».

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Камедыя «Каханне напракат».
**8.20** Драма «Пахавайце мяне за плінтусам».
**10.20** Камедыя «Джэнтльмены, удачы!»
**12.20** Старое добрае кіно. Камедыя «Волга-Волга».
**14.20** Меладрама «Начны карчмы агеньчык».
**16.20** Драма «Перакладчык».
**18.10** Драма «Радзіма».
**20.20** Драма «Душа шпіёна».
**22.35** Камедыя «Руская гульня».
**0.35** Драма «Кандагар».
**2.35** Драма «Завея».
**4.25** Камедыя «Елкі 1914».

### National Geographic

**6.00, 12.40** Сапраўдны геній.
**6.45** Код небяспекі.
**7.10, 13.30, 5.30** Навуковыя недарэчнасці.
**8.00** Золата Юкана.
**10.20** Дзікі тунец.
**11.10** Ледзяная дарога.
**11.55, 23.20, 3.10, 4.00** Расследаванні авіякатастроф.
**14.10, 18.00** Морган Фрыман. Гісторыі пра Бога.
**17.15** Гульня ў лічбы.
**21.00, 0.50** Вяртанне з мёртвых.
**21.45, 1.40** Даследчык 2.0.
**22.30, 2.25, 4.45** Ракавая стыхія.
**0.05** Паранармальнае.

### Discovery

**8.00** Загадкі планеты Зямля.
**9.00** Паляўнічы на антыкварыят.
**10.00** Металаломшчыкі.
**11.00, 23.00** Востраў.
**12.00** Выжыць разам.
**13.00, 1.00** Голыя і напалоханыя.
**14.00** Аляска: сям'я з лесу.
**15.00** Заваёўванне новых земляў.
**16.00, 21.00** Як працуюць машыны.
**17.00** Сіднэйская бухта.
**18.00, 7.10** Махінатары.
**19.00, 0.00** Мяцежны гараж.
**20.00** Вулічныя гонкі.
**22.00** Дарогі Расіі.
**2.00** Бітва з акіянам.
**4.40** Хуткія і гучныя.

---

## Ну і ну!

## ДЗЯДУЛЕЎ СКАРБ

**Нямецкая сям'я знайшла ў польскім горадзе Любомеж (Ніжняя Сілезія) скарб па карце, намаляванай іх дзядулем у 1952 годзе, паведамляе інтэрнэт-партал Onet.**



Двое маладых немцаў прыехалі за скарбам з Гамбурга. Сайт гарадской мэрыі паведамляе, што іх дзед некаторы час жыў у Любомежы і працаваў там садоўнікам, а перад тым, як пакінуць горад, закапаў каштоўнасці. Мужчыны звярнуліся да адной з мясцовых жыхарак з просьбай пазычыць рыдлёўку. Ёй гэта здалося падазроным, і яна выклікала паліцыю. Вартавыя парадку забаранілі праводзіць працы да атрымання дазволу ад профільнага ведамства, а калі папера была выдадзена, суправаджалі раскопкі. У месцы, пазначаным на карце, былі знойдзены два трэснутыя збаны, у якіх ляжалі гадзіннік, упрыгажэнні, манеты XIX стагоддзя і партабак 1935 года. Усё было адпраўлена на экспертызу. Калі высветліцца, што знаходкі ўяўляюць гістарычную каштоўнасць, іх адправяць у мясцовы музей.

Гэта не першы выпадак, калі ў горадзе знаходзяць скарбы. У 1972 годзе каля старой царквы дзеці адкапалі чару з залатымі манетамі розных еўрапейскіх краін. У 2008 годзе падчас рамонту адміністрацыйнага будынка рабочыя знайшлі тайнік з дакументамі XIX стагоддзя, самыя раннія з якіх датаваліся 1802 годам, а самыя познія — 1874-м. Любомеж (які таксама зваўся Лібенталь і Мілосна) — горад у Ніжняй Сілезіі. У розныя гады быў часткай Польшчы, Чэхіі, Германіі, па выніках Другой сусветнай вайны зноў быў перададзены Польшчы. Насельніцтва складае каля двух тысяч чалавек.

## ЗАПЛЫЎ НА 132 КІЛАМЕТРЫ

**Жыхарка штата Каларада (ЗША) праплыла без перапынку рэкордную дыстанцыю — 132 кіламетры. Марафонскі заплыў працягваўся 56 гадзін, паведамляе New York Times.**



Дасягненне ўстанавіла Сара Томас у вадасховішчы Паўэл, якое падзяляе штаты Юта і Арызона. Яно лічыцца другім па велічыні штучным вадаёмам у ЗША. Падчас заплыву Томас суправаджала судна з камандай падтрымкі, якая складалася з трынаццаці чалавек. Амерыканка не спала і не выходзіла з вады. Кожныя трыццаць хвілін памочнікі перадавалі ёй бутэльку з вадкай пажыўнай сумессю, якая складаецца з вугляводаў, электралітаў і кафеіну. Напой дапамагаў плыўчысе падтрымліваць энергію і змагацца са сном. Як адзначае New York Times, дабраўшыся да другога берага, Томас ледзь трымалася на нагах ад стомленасці. Пасля заплыву яна праспала амаль дванаццаць гадзін, а затым падсілкавалася амлетам і дранікамі. Жанчына працуе дома бальнічным менеджарам. На працягу апошніх пяці гадоў яна правяла некалькі заплываў на вялікія дыстанцыі, таксама Томас перасякала Ла-Манш і возера Таха.

Цяпер рэкорд на самы доўгі заплыў належыць аўстралійскай плыўчысе Хлоі Макардл. У кастрычніку 2014 года яна за 41 гадзіну праплыла ў Атлантычным акіяне каля 124 кіламетраў. Рашэнне аб прызнанні заплыву Сары Томас новым рэкордам пакуль не прынята ■

## Zамор'е

### Японкам вытруць слёзы на працы

Такая паслуга, уведзеная ў Японіі, дапамагае жанчынам спраўляцца са стрэсам на працы. Японкі могуць наняць сімпатычных мужчын, каб тыя прыйшлі да іх у офіс і суцешылі, калі яны плачуць. Завецца такі чалавек — «ікемеса». Стваральнік сэрвісу Хірокі Тэраі кажа, што ўсе супрацоўнікі прайшлі курс тэрапіі. Каб забраніраваць ікемеса, трэба проста патэлефанаваць у кампанію і выбраць аднаго з сямі даступных мужчын. Кошт паслугі — 7900 ен, гэта каля 150 BYN.



### Патрымаў сына — плаці!

**Жыхару амерыканскага штата Юта выставілі рахунак пры выпісцы жонкі з радзільнага дома за кантакт са сваім нованароджаным сынам, піша Buzzfeed.**

Здымак рахунку быў апублікаваны ў сецыве і за два дні сабраў больш за пяць мільёнаў праглядаў. Як высветлілася, Раян Грэслі ўзяў на рукі дзіця, якое з'явілася на свет пры дапамозе кесарава сячэння. За дадатковыя працэдуры па доглядзе за нованароджаным, якія спатрэбіліся пасля дотыку, у мужчыны запатрабавалі 39,35 долара. Грэслі трымаў малога, пакуль медсястра рабіла першую фатаграфію дзіцяці і яго маці пасля родаў. Прадстаўнік бальніцы паведаміла, што грошы былі знятыя не за тое, што амерыканец узяў дзіця, а за дадатковы догляд, які спатрэбіўся нованароджанаму пасля кантакту са скурай дарослага чалавека.

У кастрычніку 2015 года грамадзянцы Тайваня выставілі рахунак за роды на борце самалёта, які накіроўваўся ў ЗША. Пілотам прыйшлося пасадзіць паветранае судна ў адным з аэрапортаў Аляскі, каб забяспечыць бяспеку нованароджанага. Ці заплаціла жанчына каля 33 тысяч долараў за гэта, невядома.

### Паліцыя затрымала курыцу

**Паліцыя шатландскага горада Дандзі выдала справаздачу аб затрыманні курыцы, якая парушала правілы дарожнага руху, паведамляе агенцтва UPI.**



У праваахоўныя органы звярнуліся аўтамабілісты, якія зранку заўважылі птушку на праезнай частцы дарогі. Нарад прыбыў на месца здарэння і заняўся пошукамі парушальніка. Праз некаторы час курыцу знайшлі і даставілі ў аддзяленне паліцыі, а затым перадалі прадстаўнікам Каралеўскага таварыства прадухілення жорсткага абыходжання з жывёламі. Цяпер супрацоўнікі дэпартамента спадзяюцца адшукаць яе ўладальніка і ўстанавіць, з якой мэтай птушка пераходзіла дарогу.

А ў швейцарскай камуне Пантрэзіна ў чэрвені гэтага года мясцовая паліцыя беспаспяхова патрацыла некалькі дзён на пошукі каровы, якая ўцякла ад фермера. Яе знайшлі ў кантоне Граўбюндэн, дзе жывёла спрабавала выбіць рагамі дзверы атэля.

**Іван КУПАРВАС**

## Нядзеля, 23 кастрычніка

### Беларусь 1

6.50, 22.10 **Меладрама «Дзённік свекрыві».**
8.30 Народная раніца.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.45 **Серыял «Сваты-6».**
11.00 «50 рэцэптаў першага».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 **Меладрама «Прыгажуня».**
14.25 Каробка перадач.
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.15 Зона Х. Вынікі тыдня.
16.45 Тайны следства.
17.15 **Меладрама «І ў горы, і ў радасці».**
20.35 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.

### Беларусь 2

7.05 Сіткам «Розныя».
7.30, 21.10 Тэлебарометр.
7.35 «Вялікая ілюзія на Кіпры».
8.10 Элементарыум.
8.50 Кулінарны эксперымент.
9.25 «Здзіві мяне 3». Талент-шоу.
11.10 Хачу ў тэлевізар!
11.20 Ваша лато. Пяцёрачка.
11.55 **Серыял «Шчаслівыя разам 3».**
13.30 «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
14.45 «Моду народу».
15.50 **Анімацыйны фільм «Артур і помста Урдалака».**
17.30 **Фантастыка «Стартрэк: адплата».**
20.00 Нас не падманеш.
20.35 Два рублі.
21.45, 22.10 **Серыял «Косці».**
22.05 Спортлато 5 з 36, КЕНО.

### Беларусь 3

8.00, 13.25, 17.15, 21.00 Нацыянальны скарб навіны культуры. «Калейдаскоп».
8.15, 17.30 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
8.20, 17.40 **«Дзяўчына з гітарай». Камедыя.**
9.50 «Подых струн».
10.30 «Наперад у мінулае».
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
11.50 «Музеі Беларусі». Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі.
12.15 «Святыні Беларусі». Легенды возера Свіцязь.
12.45 «Цвярдыні свету». Дак. фільм «Кашмір. Брыльянт мангольскай кароны».
13.40 Robbie Williams. One Night at the Palladium.
15.05 **«Люстэрка для героя». Драма.**
19.05 **«Шэрлак Холмс і здарэнне каля вадаспада Вікторыя». Драма. 3—4-я серыі.**
20.40 «Калыханка».
21.15 «Зорка Ганны Герман». Канцэрт з удзелам Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга.
22.30 «Час кіно».
22.40 **«Каралі для маёй каханай». Меладрама.**

### Беларусь 5

7.50, 21.30 PRO спорт. Навіны.
8.00 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Іслач» (Мінскі раён) — «Тарпеда-БелАЗ» (Жодзіна).
9.25 Плаванне. Этап кубка свету. Сінгапур.
11.30 Настольны тэніс. Чэмпіянат Еўропы. Адзіночны разрад. 1/2 фіналу. Мужчыны. Жанчыны.
14.25 Піт-стоп.
14.55 Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Калеў» (Талін).
16.45 Авертайм. КХЛ.
16.55 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — ХК «Сочы». У перапынку — Авертайм. КХЛ.
19.25 Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Пік» (Венгрыя) — БГК імя Мяшкова (Беларусь).
21.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
21.40 Настольны тэніс. Чэмпіянат Еўропы. Адзіночны разрад. Парны разрад. Фіналы. Мужчыны. Жанчыны.

### АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00 (з субцітрамі), 9.00, 16.00 (з субцітрамі) Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная прапаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.45 «Фазэнда».
11.15 «Адкрыццё Кітая».
11.45 «Віцын, якога мы не ведалі».
12.45, 16.20 Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залатыя грамафон».
16.15 Навіны спорту (з субцітрамі).
17.00 Музычны фестываль «Голосящий КиВиН».
20.00 Контуры.
21.05 «Ледніковы перыяд».
23.30 «Што? Дзе? Калі?» Восеньская серыя гульняў.
0.40 **Маст. фільм «Добры год».**

### СТБ

6.00, 8.30, 11.40, 13.45, 20.25 «Дзень сенсацыйных матэрыялаў».
7.40 «Скардзіцца дазваляецца».
8.00, 16.50 «Аўтапанарама».
11.00 «Вялікае снеданне».
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
